**А. М. Кушнярэвіч**

# ГЕРМАНСКІ КАМПАНЕНТ ЭТНІЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ IX – ПАЧАТКУ XIII ст.

У зарубежнай гістарыяграфіі атрымала распаўсюджванне “тэорыя нармандскай каланізацыі”, у адпаведнасці з якой у IX–X ст. вялікія групы скандынаваў перасяліліся ва Усходняю Еўропу і пасяліліся на гандлёвых шляхах, якія злучалі Скандынавію і Русь. У выніку ўзаемадзеяння скандынаваў з усходнімі славянамі ўзніклі раннедзяржаўныя ўтварэнні з цэнтрамі; Ладага, Ноўгарад, Полацк, Кіеў (М. Н. Самонава). Развіццё этнакультурных кантактаў старажытнабеларускіх земляў у гэты час уяўляе сабой складаны працэс. Іх насельніцтва тады не было аднародным у этнічным плане. Таму фарміраванне і развіцце культуры Беларусі на мяжы І–ІІ тыс. н. э. адбывалася на шматграннай аснове, аб чым сведчаць вынікі вывучэння археалагічных помнікаў гэтага перыяду. Яны адлюстроўваюць не толькі складаны працэсс балта-славянскіх узаемаадносін, але і пэўныя кантакты з паўночнагерманскім этнасам цэнтральнай і паўднёвай Скандынавіі. Продкі нарманаў прыйшлі сюды з міграцыйнай хваляй індаеўрапейцаў у канцы ІІІ да н. э., паклаўшы пачатак фарміраванню тут прагерманскіх, а затым шэрага германскіх плямёнаў (Г. Ласкавы).

Упершыню прысутнасць вікінгаў (нарманаў) ва Усходняй Еўропе зафіксавана ў летапісным паведамленні пад 859 г., а ўжо ў 862 г. адбываецца запрашэнні славянскімі і фінскімі плямёнамі на княжанне варажскага конунга (князя) Рурыка для спынення міжусобных войнаў і абароны ад пірацкіх набегаў. У кантэксце гэтых драматычных падзей упершыню згадваецца Полацк (Г. В. Штыхаў). У прыватнасці адзначаецца, что Рурык аддаў умацаванае Полацкае селішча аднаму са сваіх ярлаў – “мужлаў”. Наступныя звесткі пра Полацк датуюцца 980 г. і яны звязаны з княжаннем у горадзе аднаго з варажскіх конунгаў Рангавальда (Рагвалода), які стварыў першую гістарычную дзяржаву ў Беларусі, заклаўшы пачатак дынастыі полацкіх князёў. Крывічы былі асноўным насельніцтвам гэтай дзяржавы, празваўшы свайго конунга-князя славяназаванай мянушкай Рагвалод. Мэтай яе самастойнай палітыкі быў кантроль над гандлёвымі шляхамі з Балтыкі праз Дзвіну і Днепр у Чорнае мора. У выніку суіснавання скандынаўскага і славянскага (крывіцкага этнасаў) дзяржаўны і юрыдычны лад Полацкага княства быў пераняты са Скандынавіі. Скандынаўскага паходжання была “Руская праўда” – збор законаў, якімі рэгулявалася жыццё Полацкай дзяржавы. Полацкае веча (*вота* – па-старабеларуску) была аналагам скандынаўскага (старажытнашведскага) *ting*. Скандынаўскай была гандлёвая сістэма вагі і аб’ёму. Полацк стаў галоўным цэнтрам вікінгаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі (А. Катлярчук). Сярод варажскіх маркераў, выяўленых у Полацку, вызначаюцца наступныя: каралінгскі меч X ст. франкскага майстра Ульбэрта,

бронзавыя наканечнікі похвы мяча з тыпова скандынаўскім арнаментам, залаты віты пярсцёнак-пячатка XI ст., шматлікія грабяні скандынаўскага тыпу X–XIII ст., 8 скандынаўскіх гірак, знаходкі ключоў ад замкоў X–XI ст., касцяная гульнявая біта з рунічным надпісам пачатку XIII ст. (Г. В. Штыхаў). Іншымі нармандскімі калоніямі на землях крывічоў былі Маскавічы (Браслаўскі р-н), Пруднікі (Міёрскі р-н), Гнездава (Смаленшчына). Пад час іх архелагічных даследаванняў таксама былі выяўлены шматлікія паўночнаеўрапейскія артэфакты як своеасаблівыя сведчанні адносін мясцовага насельніцтва з нарманамі. У прыватнасці, у Маскавічах былі выяўлены каля 100 рунічных надпісаў на косці. Што тычыцца Гнездава, то яно вядома як найбуйнейшы ў Еўропе некропаль са скандынаўскіх курганоў, якія знаходзяцца на этнічных абшарах беларусаў. Найбольш значная колькасць скандынаўскіх артэфактаў была атрымана ў працэсе раскопак культурнага слоя пасяленняў, нешматлікія прадметы ўваходзілі ў склад пахавальнага інвентару, альбо былі звязаны з грашова-рэчавымі скарбамі гэтага часу ці адносіліся да выпадковых знаходак (С. Д. Дзярновіч). Праз пасрэдніцтва нарманаў на шляху "з вараг у грэкі" паступалі як уласна скандынаўскія вырабы, так і імпарт з Захаду, Усходу, Поўдня. Таму ўздоўж Заходняй Дзвіны, Дняпра, Нёмана, Віліі і Прыпяці, а таксама ў зоне водападзелаў выяўлены шматлікія знаходкі ўзбраення, ювелірных вырабаў, побытавых рэчаў, паганскія сімвалы і амулеты, якія сталі арганічнай часткай мясцовай культуры. Сярод прадметаў паўночнаеўрапейскага паходжання найбольш прадстаўнічай з'яўляецца калекцыя ўзбраення (наканечнікі дзід, сякеры бліжняга боя, наканечнікі стрэл, фібулы). Ювелірныя вырабы выдзяляюцца рэпрэзентатыўнасцю (С. Д. Дзярновіч).

Такім чынам, нарманы пакінулі значны след у гісторыі і культуры Беларусі IX–XIII ст. У выніку ў мясцовай матэрыяльнай культуры знайшоў адлюстраванне паўночнагерманскі імпульс развіцця найбольш адчувальны ў IX–XI ст., калі прысутнасць і дзейнасць выхадцаў са Скандынавіі была найбольш значнай на старажытнабеларускіх землях.